УДК 726.5.04 (476)

# Варыянты пакрыццяў сучасных праваслаўных храмаў Беларусі (кампазіцыйны аспект)

Арабей В.Г.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Пакрыцці храмаў актыўна ўплываюць на яго формаўтварэнне, вызначаючы як канструктыўныя, планіровачныя, так і кампазіцыйныя падыходы. У архітэктуры сучасных прыходскіх храмаў быў выяўлены наступныя рашэнні: схільнае, шатровае, пазакамарнае, яруснае і купальнае.

***Схільнае пакрыццё*** з'яўляецца найбольш эфектыўным сродкам надання кампазіцыі лінейнасці ў выніку чаго ствараюцца: лінейная, лінейна-цэнтрычная і цэнтрычна-лінейная кампазіцыя. Пры скрыжаванні 2-схільных дахаў аднолькавай даўжыні арганізуецца цэнтрычная кампазіцыя. Пакрыццё аб'ёмаў рознага памеру і вышыні схільнымі дахамі можа стаць асновай кампазіцыйнай схемы, якая характарызуецца рытмам і дынамікай.

***Шатровае пакрыццё*** уладкоўваецца над аб'ёмамі з вертыкальнай воссю сіметрыі, таму асноўнай якасцю кампазіцый на яго аснове будзе праяўленая ў рознай ступені цэнтрычнасць. Найбольш ярка дадзенае рашэнне раскрываецца пры высокім пад'ёме шатра і круглым альбо гранёным у аснаванні аб'ёме. Вылучаюцца 3 асноўных варыянты кампазіцый: цэнтрычная, цэнтрычна-лінейная, лінейна-цэнтрычная. Пры спалучэнні некалькіх шатровых пакрыццяў кампазіцыя вызначаецца прасторавасцю.

***Пазакамарнае пакрыццё*** ўтвараецца вакол вертыкальнай дамінанты-вежы (купала), у сувязі з чым асноўнымі характарыстыкамі кампазіцыі з'яўляюцца цэнтрычнасць і статычнасць. Сучасная практыка храмабудавання дае прыклады 2 варыянтаў кампазіцый: цэнтрычная і цэнтрычна-лінейная, пры значным распаўсюджанні апошняга ў розных варыяцыях.

***Яруснае пакрыццё*** характарызуецца рытмічнасцю і дынамічнасцю, якія дасягаюцца паступовым памяншэннем элементаў кампазіцыі знізу ўверх. У асноўным названы прыём выкарыстоўваецца пры стварэнні вежаў, але мае вялікі эстэтычны патэнцыял пры пакрыцці асноўнага элемента аб'ёмна-прасторавай кампазіцыі храма – малітоўнай залы. У сучаснай практыцы выкарыстоўваецца для цэнтрычна-лінейных кампазіцый.

***Купальнае пакрыццё*** па кампазіцыйных якасцях падобна да шатровага з характэрным дамінаваннем вертыкальнай восі, але праяўленай у меншай ступені, і актыўна выкарыстоўваецца для стварэння цэнтрычнай і лінейна-цэнтрычнай кампазіцыі. Ужываюцца рашэнні як з адным купалам, так і з некалькімі. Для большасці кампазіцый характэрна раўнавага і статычнасць.